6. Bosse, J. Das Ende der Erwerbsarbeitsgesellschaft. Neue Aufgaben und Möglichkeiten für die Soziale Arbeit / Jörg Bosse. – München: GRIN Verlag, 2008. – 144 S.
7. DTV-Lexikon: In 20 Bd. – München: Dt. Taschenb. Verl., 1999. – Bd. 1: A – Auf. – 440 S.
8. Hoffmann, J. Grundlegende Funktionen der Arbeit für den Menschen in der heutigen Arbeitsgesellschaft: Analyse der Funktionen basierend auf dem klassischen Ansatz Marie Jahodas / Julia Hoffmann. – München: GRIN Verlag, 2011. – 104 S.
9. Meyer, U. I. Der philosophische Blick auf die Arbeit / Ursula I. Meyer. – Aachen: ein-FACH-verlag, 2003. – 199 S.

# ПЁТР ВАСІЛЬЕВІЧ АЛЯКСЕЕНКАЎ – ГІСТОРЫК І ПЕДАГОГ

*А.М. Дулаў*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

У артыкуле, прысвечаным свайму настаўніку, буйному савецкаму гісторыку, прафесару Л.С. Абэцэдарскаму, прафесар М.С. Сташкевіч пісаў: “Магчыма, прагучыць банальна, але ўніверсітэт – гэта не толькі і не столькі вучэбныя праграмы, даследаванні, лекцыі і семінары. Гэта людзі, асаблівы дух, усё тое, што разам завецца Alma Mater” [7, с. 63–64]. Гісторыя нашага ўніверсітэта таксама багатая на яскравых навукоўцаў і педагогаў, якія ў розныя перыяды стваралі і ствараюць асаблівую атмасферу навучальнай установы. Адным з такіх выкладчыкаў быў прадстаўнік латвійскай гістарычнай школы, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Пётр Васільевіч Аляксеенкаў (1938–2013) – выдатны гісторык і педагог, светлы і чулы чалавек, які заслужыў павагу і добрую памяць.

Мэта працы – прасачыць асноўныя вехі жыцця і прафесійнай дзейнасці гісторыка П.В. Аляксеенкава.

**Матэрыял і метады.** Асновай работы паслужылі матэрыялы асабістай справы П.В. Аляксеенкава з архіва ВДУ імя П.М. Машэрава [1], успаміны гісторыка [4], яго працы [2; 3; 6], а таксама невялікі, але змястоўны і душэўны артыкул, напісаны дацэнтам Г.М. Якаўлевай да юбілею Пятра Васільевіча [8]. Былі выкарыстаны агульнанавуковыя і спецыяльна-гістарычныя метады, найперш гісторыка-біяграфічны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** П.В. Аляксеенкаў нарадзіўся 24 студзеня 1938 г. у в. Папейкіна Духаўшчынскага раёна Смаленскай вобласці. У дзяцінстве хлопчыку прыйшлося перажыць жахі германскай акупацыі, цяжкасці пасляваенных гадоў. Пасля заканчэння сямігодкі Пётр Васільевіч абраў педагагічную сцежку: скончыў Гжацкае педагагічнае вучылішча, настаўнічаў у школах Смаленскай вобласці. Пасля службы ў Савецкай Арміі (1957–1960 гг.) працаваў на прадпрыемствах Рыгі. Але жаданне вярнуцца да выкладання перамагло. У 1962 г. Пётр Васільевіч паступіў на завочнае аддзяленне гісторыка-філалагічнага факультэта Латвійскага ўніверсітэта імя П. Стучкі. Пасля паспяховага заканчэння ўніверсітэта ў 1968 г. П.В. Аляксеенкаў быў запрошаны на працу ў Даўгаўпілскі педагагічны інстытут, з якім звязаны гады яго прафесійнага станаўлення [8, с. 116; 1, арк. 2 адв., 4–4 адв.].

У 1972–1975 гг. гісторык вучыўся ў аспірантуры Латвійскага ўніверсітэта, якую скончыў датэрмінова, абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме “Социал-демократические организации Латгалии с 1898 по 1907 гг.”. Навуковым кіраўніком была І.К. Апіне (1928–2019), доктар гістарычных навук, прафесар (у наступным – член-карэспандэнт Латвійскай акадэміі навук). У дысертацыі вызначаны перадумовы ўзнікнення і развіцця сацыял-дэмакратычнага руху ў краі, паказаны роля ў ім Бунда, які ўтварыў першыя масавыя рэвалюцыйныя арганізацыі ў Латгаліі, прааналізаваны працэс узнікнення асобных ад Бунда сацыял-дэмакратычных арганізацый пасля II з’езда РСДРП, іх фракцыйная прыналежнасць у пэўны перыяд, структура, колькасны склад, узаемаадносіны з Бундам, дзейнасць падчас рэвалюцыі 1905–1907 гг., а таксама работа ў салдацкім і сялянскім асяроддзі [2]. Дысертацыйнае даследаванне заснавана на шырокай базе крыніц, характарызуецца грунтоўным іх аналізам, сістэмнасцю гістарычнай рэканструкцыі дзейнасці сацыял-дэмакратычных арганізацый у Латгаліі на мяжы XIX–XX стст. Канешне, яно не пазбаўлена адбітку свайго часу, ідэалагічных клішэ, але інакш пісаць тады было папросту немагчыма.

У Даўгаўпілскім пconfigінстытуце Пётр Васільевіч працаваў на кафедры ўсеагульнай гісторыі і гісторыі СССР, выкладаў навейшую гісторыю Еўропы і Амерыкі, новую і навейшую гісторыю краін Азіі і Афрыкі, гісторыю СССР (перыяды імперыялізму і сацыялізму), а таксама



Репозиторий ВГУ

студэнтам завочнай формы навучання другую частку новай гісторыі, вёў спецкурсы і спецсемінары [1, арк. 8–9; 4, с. 3]. Выкладанне гісторык паспяхова спалучаў з навукова-даследчай дзейнасцю і грамадскай работай.

У 1979 г. Пётр Васільевіч пераехаў у Віцебск. Матывамі пераезду сталі неабходнасць дапамагаць па гаспадарцы пажылым бацькам, “нарастание националистических настроений” у Латвіі, незадаволенасць бытавымі ўмовамі [4, с. 3–4]. Гісторык пачаў працаваць на кафедры гісторыі КПСС і палітэканоміі ВДПІ імя С.М. Кірава, вёў заняткі па гісторыі партыі на розных факультэтах. Таксама члену КПСС П.В. Аляксеенкаву давялося ўзначаліць партыйную групу на факультэце фізічнага выхавання [4, с. 5]. У далейшым Пётр Васільевіч з’яўляўся намеснікам сакратара партбюро факультэта, а таксама, як і многія выкладчыкі сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, вёў грамадска-палітычную і асветную працу ў якасці пазаштатнага лектара абкама КПБ, члена метадычнага савета пры Доме палітычнай асветы абкама, лектара таварыства “Веды” [1, арк. 19]. У 1982 г. гісторыку было прысвоена вучонае званне дацэнта.

З пачатку 1990-х гг., калі выкладанне гісторыі КПСС было заменена абавязковым вывучэннем на ўсіх факультэтах педінстытута гісторыі Беларусі, Пётр Васільевіч паспяхова асвоіў не толькі саму дысцыпліну, але і беларускую мову, на якой стаў яе выкладаць. Ва ўспамінах ён выказаў словы ўдзячнасці дацэнту В.У. Акуневічу, які дазволіў зацікаўленым калегам наведваць яго лекцыі па айчыннай гісторыі, а таксама педагогам, у якіх вучыўся беларускай мове на спецыяльных курсах – Л.І. Злобін, А.С. Дзядовай, Я.Н. Марозавай [4, с. 11–12].

У 1990 г. на філалагічным факультэце ВДПІ пачалася падрыхтоўка настаўнікаў рускай мовы і літаратуры з дадатковай спецыяльнасцю «гісторыя». На супрацоўнікаў кафедры гісторыі КПСС і палітэканоміі было ўскладзена чытанне профільных гістарычных курсаў. У 1993 г. падрыхтоўка гісторыкаў была перададзена на новы факультэт беларускай філалогіі і гісторыі, дзе была адкрыта спецыяльнасць “беларуская мова і літаратура і гісторыя”. Са студэнтамі названых спецыяльнасцяў і працаваў Пётр Васільевіч: выкладаў, як і раней у Даўгаўпілсе, гісторыю Еўропы і Амерыкі новага і навейшага часу, новую і навейшую гісторыю краін Азіі і Афрыкі, ажыццяўляў кіраўніцтва курсавымі і дыпломнымі працамі. Пасля таго як у 1998 г. кафедра ўсеагульнай гісторыі і гісторыі Беларусі была рэарганізавана, П.В. Аляксеенкаў застаўся працаваць на кафедры гісторыі Беларусі, вёў заняткі па гэтай дысцыпліне, а таксама чытаў спецкурс па выбары студэнтаў “ЗША у Другой сусветнай вайне”. Лекцыі і семінары Пятра Васільевіча характарызаваліся высокім навукова-метадычным узроўнем, ён умеў зацікавіць студэнтаў, выклікаць у іх патрэбу ў вывучэнні крыніц і дадатковай літаратуры па тэме, у асэнсаванні няпростых праблем гісторыі.

Сам Пётр Васільевіч ніколі не спыняўся на дасягнутым, працягваў займацца навуковымі даследаваннямі. П.В. Аляксеенкаў – аўтар больш як 30 навуковых і вучэбна-метадычных публікацый. На першы погляд гэта не так і шмат, але тут варта улічваць, што сярод іх нямала артыкулаў у рэцэнзаваных выданнях, ды і магчымасцяў для публікацыі ў часы творчага росквіту навукоўца было не так шмат, як зараз. Пётр Васільевіч імкнуўся да ўдасканалення ведаў і метадычнага майстэрства, цікавіўся новымі падыходамі і дасягненнямі гістарычнай навукі. Так у 1998 г. сумесна з Г.М. Якаўлевай ён падрыхтаваў артыкул, прысвечаны аналізу цывілізацыйнай канцэпцыі Арнольда Тойнбі [2].

Пётр Васільевіч заўсёды падтрымліваў маладых выкладчыкаў. Найперш моладзі адрасаваны падрыхтаваныя ім метадычныя рэкамендацыі па выкладанні гісторыі Беларусі ў вышэйшай навучальнай установе [6]. Метадычныя парады па чытанні лекцый, правядзенні семінарскіх заняткаў, кансультацый, арганізацыі самастойнай работы студэнтаў, працы са студэнтамі завочнай формы навучання, прыёме залікаў і экзаменаў, прапанаваныя ў тым ліку, зыходзячы з уласнага вопыту і вопыту калег, у асноўным не згубілі сваёй актуальнасці і сёння. Яны выкарыстоўваюцца магістрантамі спецыяльнасці “гісторыя” пры вывучэнні дысцыпліны “Метадалагічныя асновы выкладання гісторыі ў вышэйшай школе”. Складальнік разлічваў на творчы падыход да рэалізацыі метадычных парадаў. У прадмове ён пісаў: “Надеюсь, что настоящая работа будет полезной, хотя искать готовые ответы на возникающие вопросы здесь вряд ли стоит. Если этот труд заставит задуматься, наведет на размышления – буду считать свою задачу выполненной” [6, с. 4].

Пётр Васільевіч карыстаўся заслужанай павагай калег і студэнтаў. У артыкуле да 60-годдзя гісторыка Г.М. Якаўлева адзначала: “Гуманность, чуткость, уважительное отношение



Рэпазіторый ВДУ

как к коллегам, так и к студентам снискали П.В. Алексеенкову высокий авторитет в коллективе нашего университета <...> Для членов кафедры всеобщей истории и истории Беларуси, всех коллег Петр Васильевич является примером организованности, требовательности к себе и уважительного отношения к товарищам, доброжелательности и оптимизма” [8, с. 117]. Як чалавек, якому давялося працаваць побач з Пятром Васільевічам, магу пацвердзіць, што гэта не юбілейнае славаслоўе.

У 2006 г. гісторык перажыў інфаркт, яму была вызначана II група інваліднасці, якая выключае магчымасць працаваць. А вярнуцца да выкладання хацелася. Як казаў тады Пётр Васільевіч, яму не раз снілася, што ён у аўдыторыі. Відавочна, настальгія па педагагічнай працы і стала галоўным матывам напісання невялікіх мемуараў, названых «Кафедра истории Беларуси в Витебском государственном университете им. П.М. Машерова с 1980 по 2000 гг. (воспоминания)», апошні варыянт якіх датаваны 15 сакавіка 2007 г. [4; 5].

Да апошніх дзён жыцця П.В. Аляксеенкаў працягваў цікавіцца гісторыяй, вывучаць працы класікаў гістарычнай думкі, напрыклад, перачытваў М.М. Карамзіна. Шмат увагі надаваў свайму даўняму захапленню – рыбалоўству. Калі-нікалі наведваў калег на кафедры, а мы хадзілі ў госці да яго. У сакавіку 2013 года Пятра Васільевіча не стала.

**Заключэнне.** Такім чынам, лёс гісторыка П.В. Аляксеенкава – гэта тыповы лёс навукоўца і педагога яго пакалення, чалавека, які ўсяго ў жыцці дасягнуў сам, уласнай працай. Талентавіты даследчык, галоўнай тэмай прац якога быў рэвалюцыйны рух у Латгаліі на мяжы XIX–XX стст., ён зрабіў сваім прыярытэтам педагагічную дзейнасць, перадаваў веды і вопыт студэнтам і малодшым калегам. Пётр Васільевіч быў і застаецца для тых, хто яго ведаў, узорам прафесіяналізму, прыстойнасці і чалавечнасці.


1. Алексеенков Петр Васильевич. Личное дело // Архив ВГУ имени П.М. Машерова. – Ф. 204. Оп. 17. Д. 1. – 68 л.
2. Алексеенков, П. В. О цивилизационном подходе к истории (Теория цивилизаций А. Тойнби и современность) / П. В. Алексеенков, Г. Н. Яковлева // Веснік ВДУ. – 1997. – № 2. – С. 3–7.
3. Алексеенков, П. В. Социал-демократические организации Латгалии с 1898 по 1907 гг. : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.01 / П. В. Алексеенков ; Латвийский ордена Трудового Красного Знамени государственный университет им. Петра Стучки. – Рига, 1974. – 29 с.
4. Алексеенков, П. В. Кафедра истории Беларуси в Витебском государственном университете им. П. М. Машерова с 1980 по 2000 гг. (воспоминания) [Электронный ресурс] / П. В. Алексеенков // Личный архив автора.
5. Дулов, А. Н. Воспоминания витебского историка П.В. Алексеенкова как исторический источник / А. Н. Дулов // Актуальные проблемы источниковедения : материалы V Международной научно-практической конференции к 110-летию Витебской ученой архивной комиссии, Витебск, 25–27 апреля 2019 г. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: А. Н. Дулов и М. Ф. Румянцева (отв. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ имени П.М. Машерова, 2019. – С. 356–360.
6. Преподавание истории Беларуси в вузе : методические рекомендации / сост. П. В. Алексеенков. – Витебск : Изд-во УО «ВГУ им. П.М. Машерова», 2004. – 66 с.
7. Сташкевіч, М. С. Лаўрэнцій Абэцэдарскі: народжаны стаць гісторыкам / М. С. Сташкевіч // Беларуская думка. – 2011. – № 7. – С. 60–65.
8. Яковлева, Г. Н. П.В. Алексеенков (к 60-летию со дня рождения) / Г. Н. Яковлева // Веснік ВДУ. – 1997. – № 4. – С. 116–117.


## ИЗМЕНЕНИЕ ИДЕНТИЧНОСТИ В УСЛОВИЯХ КРОСС-КУЛЬТУРНОГО ПЕРЕМЕЩЕНИЯ КАК ГЛОБАЛЬНЫЙ ТРЕНД СОВРЕМЕННОСТИ


*Д.А. Канашевич-Адыгезалова*
*Могилевский филиал «БИП институт правоведения»*


На рубеже XXI века в условиях интенсификации и диверсификации кросс-культурных перемещений актуализировалась проблема последствий межкультурного взаимодействия и поиска оптимальных адаптационных стратегий поведения.

Цель – анализ тех подвижек, которые наблюдаются в концептуальном обосновании изменений, происходящих в идентичности людей в ситуации кросс-культурного перемещения.

**Материал и методы.** Источниковедческой базой послужили оригинальные теоретические и эмпирические исследования западных и отечественных социальных психологов и социологов. Методологическую базу исследования составили методы теоретической социологии, вторичный анализ эмпирических социологических исследований.

**Результаты и их обсуждение.** Большинство современных западных авторов характеризуют изменения, происходящие в процессе межкультурного взаимодействия, посредством по-



Репозиторий ВГУ